**102.** Выразна прачытайце заклічкі, вымаўляючы выдзеленыя словы з большай сілай голасу. З якіх сказаў складаюцца заклічкі?

1. Божая кароўка,
**паляці** на неба:
там твае дзетачкі
ядуць цукерачкі.
Сама **паясі**
і нам **прынясі**.

2. Сонейка-сонца,
**выглянi** ў аконца,
**пасвяці** нам трошкі,
дам табе гарошку.

Спішыце заклічку, якую вымаўляюць у пахмурны дзень.
❖ Вывучыце заклічку на памяць.

## Клічныя сказы

**103.** Разгледзьце малюнкі. Выразна прачытайце сказы пад малюнкамі з улікам паметак у слупку справа.



| | |
|---|---|
| — Якую адзнаку ты атрымаў за дыктант? | *спакойна, з цікавасцю* |
| — Я атрымаў за дыктант дзясятку. | *спакойна, з задавальненнем* |



Правообладатель Национальный институт образования



| | |
|---|---|
| — Я атрымаў за дыктант дзясятку! | *з вялікай радасцю* |
| — Ты атрымаў дзясятку?! | *з радасным здзіўленнем* |
| Малайчына, сынок! | *з задавальненнем* |



| | |
|---|---|
| — Паўлік, сядай хутчэй за стол! Паглядзі, які мы з мамай пірог спяклі! | *з вялікай радасцю* |
| — Сынок, сядай за стол побач з Палінкай. | *спакойна і ласкава* |

Прачытайце сказы, у якіх выказваецца:

1) паведамленне;

2) пытанне;

3) запрашэнне да дзеяння.

Якія з іх вымаўляюцца з моцным пачуццём? Што стаіць у канцы гэтых сказаў? Выпішыце іх.



Правообладатель Национальный институт образования

Сказ, у якім выказваецца моцнае пачуццё, называецца **клічным**. У канцы апавядальнага клічнага і пабуджальнага клічнага сказаў ставіцца клічнік (!). У канцы пытальнага клічнага сказа ставяцца пытальнік і клічнік (?!).

**104.** Выразна прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на знакі прыпынку ў канцы гэтых сказаў.

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі.**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі!**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі?**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі?!**

Давайце заўтра паедзем у **Дуду́ткі.**

Давайце заўтра паедзем у **Дуду́ткі!**

   

Назавіце сказы: а) апавядальныя; б) пытальныя; в) пабуджальныя. Якія з іх з'яўляюцца клічнымі? Выпішыце пытальны клічны сказ.

**Рм** Раскажыце, што вы ведаеце пра музейны комплекс «Дудуткі».



Правообладатель Национальный институт образования

**Клічныя сказы вымаўляюцца больш высокім тонам з выдзяленнем слова, якое выказвае пачуццё радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення.**

**105.** Выразна прачытайце клічныя сказы. Якія з іх з'яўляюцца апавядальнымі, якія — пытальнымі, а якія — пабуджальнымі?

1. Хто намаляваў такі незвычайны малюнак?! 2. Мілая бабуля, раскажы мне казку! 3. Як прыемна гуляць сонечным днём у лесе! 4. Сябры, давайце дапаможам птушкам! 5. Дзе растуць такія прыгожыя кветкі?! 6. Дзяўчынкі, перастаньце смяяцца!

**смяя́цца**

Выпішыце пабуджальныя клічныя сказы.

**106.** Прачытайце верш. На што ён падобны: на заклічку ці на лічылку?

Дожджык, дожджык залаты,
не міна́й нікога ты.
Гулкім громам грукачы!
Мы паспеем у*(т/ц)*ячы,
мы не бу*(д/дз)*ем оха*(т/ц)*ь,
нас не напалоха*(т/ц)*ь!

*К. Буйло.*

**не міна́й** — *тут:* не абыходзь, не праходзь міма



Правообладатель Национальный институт образования

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Падкрэсліце пабуджальныя сказы.

Назавіце клічныя сказы.

❖ Навучыцеся выразна чытаць верш.

**107.** Разгледзьце малюнкі. Выразна прачытайце сказы. Да якога з малюнкаў падыходзіць кожны сказ?











1. Як праверыць правапіс прапушчанай літары?
2. Як прыемна ў парку сонечным днём!
3. Колькі прыкладаў запісана на дошцы?
4. Колькі фарбаў падарыла восень дрэвам!

Запішыце клічныя сказы. Якія пачуцці (захапленне, здзіўленне, смутак, вялікае задавальненне) у іх перадаюцца? Падкрэсліце словы, з якога пачынаецца кожны сказ.



Правообладатель Национальный институт образования

Клічныя сказы могуць пачынацца словамі, якія дапамагаюць перадаць пачуцці радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення: ***колькі, як, які, эх, ай, о, ой, няхай (хай), дык.***

**108.** Выразна прачытайце верш. Якая спадчына нам засталася ад продкаў? Як яе захаваць і перадаць іншым пакаленням?

## Мы — беларусы

Мы жывём на зямлі,
той,
што лёсам нам дадзена,
дзе адвеку жылі
нашы мудрыя прадзеды.
Як жа іх не згадаць,
што змаглі нам у спа́дчыну
гэты край перадаць
з мовай роднаю,
матчынай?!

*А. Зэкаў.*

**лёс** — доля, жыццё (*рус*. судьба)
**спа́дчына** — тое, што перайшло нам ад продкаў

Спішыце пытальны клічны сказ. Падкрэсліце слова, якім ён пачынаецца. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказа.


Правообладатель Национальный институт образования

**109.** Прачытайце віншаванне. Назавіце ў ім пабуджальны клічны сказ. Якім словам ён пачынаецца?

Дарагі сябар!

Прымі мае віншаванні з днём нараджэння. Я жадаю табе здароўя і поспехаў у вучобе. Няхай збудуцца ўсе твае мары!

Сяргей.

Рм З чым людзі могуць павіншаваць адзін аднаго? Чаго звычайна жадаюць у прыгаданых выпадках? Складзіце па гэтым узоры віншаванне аднаму са сваякоў. Запішыце.

**110.** Прачытайце вершаваныя радкі з моцным пачуццём радасці. Які знак прыпынку трэба паставіць у канцы сказа?

Святкуй, спявай, мой родны край,
усмешкай светлай шчыра ззяй

*У. Мацвеенка.*

**111.** Прачытайце сказы з моцным пачуццём.

1. Колькі хараства́ і чароўнага прывабу ў сініх да́лях *(Я. Колас.)* 2. Якія знаёмыя назвы і словы, якая цудоўная родная мова *(П. Панчанка.)*



Правообладатель Национальный институт образования

3. Ой, як не хочацца расставацца *(П. Рунец.)* 4. Дык няхай завеі нам лыжню навеюць *(М. Сазончык.)* 5. Гэй, памочнікі, пара абедаць *(П. Рунец.)*

Спішыце, пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце словы, з якіх пачынаюцца клічныя сказы.

## Галоўныя і даданыя члены сказа

### Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа

**112.** Спішыце, дапаўняючы сказы ў тэксце патрэбнымі словамі.

... зацягнулі ўсё неба. Падзьмуў халодны ... . Заблішчалі яркія ... . Грымнуў ... . На зямлю паліў ... .

... схаваліся пад лісце. ... сцішыліся ў гнёздах.

Словы для даведкі: *жучкі, хмары, птушкі, вецер, дождж, маланкі, гром.*

Якую назву можна даць тэксту?

Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной лініяй.

> Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, — гэта **дзейнік.** Дзейнік адказвае на пытанні х т о? ш т о?



Правообладатель Национальный институт образования